# *СУСТРЭЧА 2*

# *СУПОЛЬНАСЦЬ, ЯКАЯ МОЛІЦЦА*

---

«Сапраўды таксама кажу вам, што калі двое з вас на зямлі згодна прасілі б аб чым-небудзь, то станецца ім ад Айца Майго, які ў нябёсах» (Мц 18, 19).

---

## 1. Уводзіны

Наша супольнасць сустракаецца для Бога і дзеля жадання сустрэцца з Хрыстом. Таму мы хочам стаць евангельскай супольнасцю.

Асноўнай рысай евангельскай супольнасці з'яўляецца малітва. Малітва – гэта жыццёвая неабходнасць кожнага хрысціяніна. Яна адчыняе крыніцы любові, якая з'яўляецца дарам неба. Узор малітвы для нашай супольнасці – гэта малітва ў Вячэрніку пасля Уваскрасення. У Вячэрніку напалоханыя апосталы разам з Марыяй трывалі ў малітве. Як вядома, гэтая малітва не засталася без адказу. Усе сабраныя ў Вячэрніку атрымалі Духа Святога, Які даў ім здольнасць сведчыць аб любові Бога.

## 2. Сустрэча суполкі



## *І ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*

- ***Супольны пасілак і дзяленне жыццём***

---

Падчас штомесячных сустрэчаў патрэбна прызначыць час (гэта можа быць падчас пасілку), каб падзяліцца перажываннямі – сямейнымі, працоўнымі, грамадскімі, касцельнымі; поспехамі і памылкамі, радасцямі і смуткамі.

*Карта END*

---

Перад пасілкам мы памолімся. Самай вядомай малітвай перад пасілкам з'яўляецца малітва: *«Благаславі, Пане Божа, нас і гэтыя дары, якія будзем спажываць з Тваёй святой дабрыні і міласэрнасці, і навучы нас дзяліцца хлебам і радасцю з тымі, хто іх не мае. Праз Хрыста, Пана нашага. Амэн».* Сутнасцю малітвы перад ежай з'яўляецца ўдзячнасць за дары, якія мы атрымліваем.

Падрыхтуйцеся ў сужэнстве, каб дзяліцца жыццём. Супольна выберыце дзве ці тры падзеі, якія адбыліся за апошні час і якія вы лічыце найважнейшымі для вашага сужэнства, сям'і. Кожны з вас – і муж, і жонка – павінны прыняць удзел у моманце, калі мы дзелімся жыццём.

Пасля заканчэння гэтай часткі сустрэчы мы збіраем посуд са стала і ўрачыста запальваем свечку, якая сімвалізуе прысутнасць Хрыста.

## *II ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*

- **На гэтай сустрэчы мы зробім выключэнне і перш, чым мы пачнем маліцца, мы прысвяцім крыху часу, каб паразмаўляць пра малітву *Магніфікат* і значэнне гэтай малітвы для Руху.**

МАЛІТВА МАГНІФІКАТ

Суполка з’яўляецца малым Касцёлам, які моліцца. Рух Equipes Notre-Dame выбраў *Магніфікат* малітвай супольнасці. На заканчэнне сустрэчаў удзельнікі суполак моляцца словамі гэтага спеву. На гэтай сустрэчы мы першы раз супольна памолімся *Магніфікат*. Гэта будзе пачаткам нашай супольнай малітвы.



*Магніфікат*

Велічае душа мая Пана,
і ўзрадаваўся дух мой у Богу, маім Збаўцу,

бо глянуў Бог на пакору сваёй слугі.
І цяпер благаслаўляць мяне будуць усе пакаленні.

Бо вялікае ўчыніў мне Усемагутны,
а імя Яго святое.

І міласэрнасць Яго з пакалення ў пакаленне
над тымі, хто Яго баіцца.

Паказаў моц сваёй правіцы,
рассеяў тых, хто пыхлівы сэрцам.

Скінуў магутных з трона
і ўзвысіў пакорных.

Дабром галодных насыціў,
а багатых ні з чым адправіў.

Прыняў свайго слугу Ізраэля,
памятаючы пра сваю міласэрнасць,

як абяцаў бацькам нашым,
Абрагаму і яго патомству навекі

Хвала Айцу і Сыну,*
і Духу Святому.

Як была спрадвеку, цяпер і заўсёды,*
і на векі вечныя. Амэн.

*Магніфікат* з’яўляецца таксама **сужэнскай малітвай** для параў, якія належаць да Руху Equipes Notre-Dame. *Магніфікат* належыць адмаўляць штовечар, супольна мужам і жонкай, калі гэта магчыма. У гэтай малітве мы выказваем удзячнасць Богу за вялікія рэчы, якія Ён робіць у нашым жыцці.

Гэта малітва будзе лучыць вас з міжнароднай супольнасцю сужэнстваў, якія прымаюць удзел у Руху Equipes Notre-Dame, а таксама з супольнасцю Паўсюднага Касцёла.

- **Гэтаму спеву Марыі 15 лютага 2006 года на генеральнай аўдыенцыі прысвяціў катэхезу папа Бенедыкт XVI.**

1. Мы дайшлі да краю доўгай дарогі, якую распачаў пяць год таму, вясной 2001 года, мой дарагі папярэднік, незабыўны папа Ян Павел II. Вялікі Папа хацеў у сваіх катэхезах па чарзе агаварыць усе псальмы і спевы, з якіх складаецца літургія Ютрані і Нешпараў. Дайшоўшы да мэты гэтай «пілігрымкі сярод тэкстаў», якая прыпамінае вандроўку сярод квітнеючых садоў праслаўлення, просьбаў, малітвы і сузірання, мы засяроджваем сваю ўвагу на спеве *Магніфікат* (Лк 1, 46-55), які кожны раз дасканала завяршае Нешпары.

Гэта спеў, які дакладна адлюстроўвае духоўнасць біблійных «анавім», гэта значыць верных, якія лічацца «убогімі» не толькі з пункту гледжання адмаўлення ад ўсякага ідалапаклонства і ўлады, але таксама з пункту гледжання глыбокай пакоры сэрца, свабоднага ад спакусаў пыхі і адкрытага на дзеянне збаўляючай Божай ласкі. Увесь спеў *Магніфікат*, які мы зараз праслухалі ў выкананні Хора Сікстынскай Капэлы, пазначаны гэтай «пакорай», па-грэцку «*tapeinosis*», якая паказвае на канкрэтную сітуацыю пакоры і ўбоства.

2. Першая частка біблійнага спеву (пар. Лк 1,46-50) з’яўляецца як бы голасам саліста да неба, каб дасягнуць Бога. Мы чуем голас Найсвяцейшай Панны Марыі, якая такім чынам выказваецца аб сваім Збаўцы – Тым, Хто здзейсніў вялікія рэчы ў яе душы і целе. Заўважым таксама, што ў спеве ўвесь час прамаўляецца ад першай асобы: «душа мая (...) дух мой (...) маім Збаўцу (...) благаслаўляць мяне будуць (...) вялікае ўчыніў мне». Таму сутнасцю гэтай малітвы з’яўляецца праслаўленне Божай ласкі, якая дзейнічала ў сэрцы і ў жыцці Марыі, робячы яе Маці Бога.

Унутраную структуру яе малітоўнага спеву складаюць: праслаўленне, падзяка і поўная ўдзячнасці радасць. Аднак гэта асабістае сведчанне яна не перажывае ў самоце і толькі ўнутрана, індывідуальным чынам, бо Панна Марыя ведае, што мусіць споўніць місію для чалавецтва, а яе жыццё ўпісана ў дзеі збаўлення. Таму яна можа сказаць: «І міласэрнасць Яго з пакалення ў пакаленне над тымі, хто Яго баіцца» (Лк 1,50). У гэтым праслаўленні Госпада Маці Божая дае голас усім адкупленым стварэнням, якія ў яе «так» (*fiat)*, а тым самым у Асобе народжанага з Панны Езуса, знаходзяць Божую міласэрнасць.

3. У гэтым месцы пачынаецца другая, паэтычная і духоўная, частка *Магніфікат* (Лк 1, 51-55). Яна мае больш харавы характар – быццам да голасу Марыі далучыўся голас усёй супольнасці верных, якія праслаўляюць дзівосныя Божыя планы. У арыгінальнай грэцкай версіі Евангелля паводле Лукі тут змешчана сем дзеясловаў у аорысце, якія паказваюць на такую ж колькасць дзеянняў, якія Бог нястомна творыць у дзеях: «паказаў моц (...) рассеяў тых, хто пыхлівы сэрцам (...) скінуў магутных (...) ўзвысіў пакорных (...) дабром галодных насыціў (...) багатых ні з чым адправіў (...) прыняў свайго слугу Ізраэля».

У гэтых сямі Божых дзеяннях бачны «стыль», які Пан прымае ў сваіх паводзінах - Ён стаіць на баку апошніх. Яго задума часта можа быць прыкрытая

людскімі гісторыямі жыцця, дзе бачны трыумф «пыхлівых сэрцам, магутных і багатых». Аднак у рэшце рэшт Яго таямнічая моц аб'яўляецца, каб паказаць, каго сапраўды Бог любіць: «тых, хто Яго баіцца», верных Яго слову. «Пакорных, галодных, свайго слугу Ізраэля» - гэта значыць супольнасць Божага Народу, якую складаюць «убогія», людзі з простым і чыстым сэрцам, так як Марыя. Гэта «малы статак», якога Бог заахвочвае, каб ён не баяўся, бо спадабалася Айцу даць яму Сваё валадарства (пр. Лк. 12, 32). І так спеў запрашае нас, каб мы далучыліся да гэтага малога статку і сапраўды належалі да Божага Народу, які адзначаецца чысцінёй і прастатой сэрца і любіць Бога.

4. Таму прымем заахвочванне, якое ў сваім каментарыі да тэксту *Магніфікат* скіроўвае да нас св. Амброзій. Вось што гаворыць вялікі доктар Касцёла: «няхай у кожным будзе душа Марыі, каб праслаўляць Бога; няхай у кожным будзе дух Марыі, каб радавацца ў Богу. Калі па целу ёсць толькі адна Маці Хрыста, то па веры ўсе душы нараджаюць Хрыста; кожная, бо прымае у сябе Слова Божае. (...)». Душа Марыі праслаўляе Бога, а яе дух радуецца ў Богу, бо і душой, і духам яна належыць Айцу і Сыну, з пабожным пачуццём яна праслаўляе адзінага Бога, ад Якога усё паходзіць, а таксама адзінага Пана, дзякуючы Якому існуюць усе рэчы».

*(Esposizione del Vangelo secondo Luca, 2, 26-27: SAEMO, XI, Медыялан-Рым 1978, ст. 169)*

У гэтым цудоўным каментарыі святога Амброзія да *Магніфікат* мяне заўсёды асаблівым чынам ўражваюць дзівосныя словы: «Калі па целу ёсць толькі адна Маці Хрыста, то па веры ўсе душы нараджаюць Хрыста; кожная, бо прымае у сябе Слова Божае». Такім чынам святы доктар, інтэрпрэтуючы словы Маці Божай, заахвочвае нас старацца, каб Бог знайшоў дом у нашай душы і ў нашым жыцці. Мы павінныя мець Яго не толькі ў сэрцы, але таксама несці свету. Дзякуючы гэтаму мы зможам нараджаць Хрыста для нашых часоў. Мы павінны прасіць Бога, каб Ён дапамог нам праслаўляць Яго, наследуючы постаць і дух Марыі і несці нанова Хрыста нашаму свету.

## ***Малітва супольнасці***

Супольная малітва – гэта цудоўны спосаб, каб сустрэцца адзін з адным на больш глыбокім узроўні, дасягнуць супольнасці душаў, усвядоміць сабе прысутнасць Хрыста ў супольнасці. Аднак дасягнуць гэтага ўсяго малітва можна толькі, калі будзе дастаткова доўгай і дапаможа суцішыцца, адарвацца ад клопатаў. Ёй патрэбна прысвяціць мінімум пятнаццаць хвілін перад тым, як дзяліцца думкамі.

*Карта END*

Малітва супольнасці на сустрэчах суполак звычайна складаецца з наступных элементаў: малітвы да Святога Духа, слухання і разважання над Словам Божым, спантаннай малітвы і малітвы, у якой мы давяраем супольнасці самае галоўнае для нас у гэты час – інтэнцыі асабістыя, Касцёла і свету. Збірае інтэнцыі і прадстаўляе іх Богу ад імя супольнасці святар – духоўны дарадчык.

Пачынаючы з наступнай сустрэчы вы можаце папрасіць аб малітве ў інтэнцыі, асабліва важнай для вас, каб уся супольнасць памятала аб ёй у сваіх малітвах.

• ***Слуханне і разважанне над Словам Божым***

На кожную сустрэчу суполкі запрапанаваны тэкст Святога Пісання, які дапамагае нам пачуць Бога. Слуханне Бога патрабуе засяроджанасці, падчас якой мы разважаем над пачутым Словам. Так аб слуханні Божага Слова гаварыў айцец Кафарэль:

«Сустрэць Езуса Хрыста азначае найперш пачаць слухаць Таго, Хто прысутны тут. Пісанне кажа нам аб любові да Божага Слова. Ён гаворыць з намі падчас сустрэчы рознымі спосабамі, але трэба мець сэрца, якое слухае, як гаворыць нам біблійны выраз. Бог гаворыць, каб кожнаму даверыць Свае сакрэты. Ён гаворыць, а нам здаецца, што гэта ўсё так цяжка перамяніць у дзеянне. Ён не спыняецца толькі на словах, але і перамяняе тых, хто вызнае сваё бяссілле і дае ім Духа Сілы, Таго самага, Які з галілейскіх вяскоўцаў зрабіў нястомных сведкаў Збаўцы».

Кс. Анры Кафарэль

***Дзяленне Божым Словам***

Калі мы дзелімся Божым Словам, Бог прамаўляе да нас не толькі непасрэдна праз Слова. Ён гаворыць з намі таксама і праз удзельнікаў сустрэчы. Бог, дакранаючыся да нашых сэрцаў, прагне, каб мы былі таксама сведкамі. Таму не пакідайце толькі для сябе таго, што пачуеце. Самарытанка, якая сустрэла Хрыста пры студні Якуба, пачула, што Ён ёй сказаў. І тое, што пачула, яна не пакінула толькі для сябе: *«Тады жанчына пакінула свой збан і адышла ў горад, і казала людзям: «Ідзіце, паглядзіце на чалавека, які расказаў мне ўсё, што я зрабіла. Ці не Хрыстус Ён?»* (Ян 4, 28-29). Хрыстос застаўся ў самарытанскім мястэчку яшчэ на два дні і *«яшчэ больш людзей паверыла дзякуючы Ягонаму слову»* (Ян 4, 41).

Калі дзелімся, будзем памятаць пра дзве ўмовы. Мы дзелімся тым, што пачулі ў сваім сэрцы. Не павучаем, не тлумачым. Гэта роля святара – духоўнага дарадчыка. Другая ўмова адносіцца да часу нашай прамовы. Прамова не павінна быць доўгай. Мы павінны памятаць аб прысутнасці іншых удзельнікаў сустрэчы.

***Слова Божае***

**Звеставанне Марыі (Лк 1, 26-38)**

У шосты месяц Бог паслаў анёла Габрыэля ў горад галілейскі, называны Назарэт, да Дзевы, заручанай з мужам па імені Юзаф, з дому Давіда, а імя Дзевы — Марыя. Анёл, увайшоўшы да Яе, сказаў: «Вітай, поўная ласкі, Пан з Табою». Яна ж збянтэжылася ад словаў ягоных і разважала, што гэта за прывітанне. І сказаў Ёй анёл: «Не бойся, Марыя, бо знайшла Ты ласку ў Пана. Вось зачнеш ва ўлонні сваім і народзіш Сына, і дасі Яму імя Езус. Ён будзе вялікі і будзе названы Сынам Найвышэйшага, і дасць Яму Пан Бог трон Давіда, бацькі Ягонага, і валадарыць будзе над домам Якуба вечна, а валадарству Яго не будзе канца».

І сказала Марыя анёлу: «Як станецца гэта, калі я мужа не знаю?» Анёл сказаў Ёй у адказ: «Дух Святы сыдзе на Цябе, і моц Найвышэйшага ахіне Цябе. Таму і Святое, што народзіцца, будзе названа Сынам Божым. Вось і Альжбета, сваячка твая, і яна зачала сына ў старасці сваёй; і ўжо на шостым месяцы тая, якую называлі бясплоднай, бо для Бога няма нічога немагчымага». Тады Марыя сказала: «Вось я, слуга Пана. Няхай мне станецца паводле твайго слова». І адышоў ад Яе анёл.

***Спантанная малітва***

Гэта малітва, у якой на першых сустрэчах, праз заахвочванне пілатуючай пары, мы называем свае просьбы. Звычайна малітва пачынаецца з падзякі. Мы за многае мусім дзякаваць Богу! Пасля мы можам праслаўляць Бога, гэта можа быць складана, асабліва на пачатку. Звычайна ў канцы мы скіроўваем свае просьбы да Бога. У спантаннай малітве мы можам шмат разоў паўтараць свае просьбы. На наступных сустрэчах мы будзем напаўняць гэту малітву іншымі элементамі. Не выказвайце прэтэнзій, калі ў пэўны момант пілатуючая пара будзе вымушана перарваць малітву. Пілатуючая пара павінна сачыць, каб сустрэча не зацягнулася больш, чым на тры гадзіны.

***Малітвы Касцёла***

Багацце малітваў Касцёла вельмі вялікае. Пералічым толькі некаторыя з іх: Літургія гадзінаў, Ружанец, Каронка да Божай Міласэрнасці, Літаніі. Мы далучаемся да малітвы Касцёла, калі на сустрэчы адмаўляем адну з такіх малітваў.

***Эўхарыстыя***

Некаторыя супольнасці час ад часу на сустрэчы ўдзельнічаюць ў Эўхарыстыі. Абвяшчэнне Слова Божага, інтэнцыі і малітвы належаць да сутнасці Эўхарыстыі.

## *III ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*

***Духоўнае жыццё. Паглыбленне веры і любові***

Мы ўжо зрабілі першы крок, каб падзяліцца духоўным жыццём, калі пачалі дзяліцца Словам Божым. Дзелячыся тым, што мы пачулі ў Слове Божым, мы дазволілі іншым спазнаць нашы асабістыя адносіны з Богам. Паступова момант, калі мы дзелімся духоўным жыццём, будзе станавіцца істотнай часткай кожнай сустрэчы суполкі. Гэта час, калі сужэнствы дзеляцца сваім духоўным шляхам у атмасферы малітвы, братэрскага слухання, суперажывання, якое, аднак, не выключае патрэбы ставіць патрабаванні адно аднаму. Атмасфера заахвочвання і узаемадапамогі спрыяе дзяленню духоўным жыццём.

- ***Тэкст да абмену думкамі***

*Адарацыя, ахвяра, праслаўленне, боязь Божая, падзяка – усе гэтыя фундаментальныя рэлігійныя паставы чалавека, які моліцца, можна зразумець толькі праз прызму яго адносінаў з Богам. Калі вы адкрываеце, што ўсё паходзіць ад Бога, ці не адчуваеце вы часам такой патрэбы, каб належаць Яму цалкам у паставе ахвяры і адданасці?*

*Калі вы сузіраеце Божую Веліч, альбо Яго дзеянне сярод стварэння, здзіўленне, якое нараджаецца ў вашым сэрцы, просіцца ў словы разам з песняй праслаўлення! Шмат псальмаў узнікла менавіта з такога сузірання.*

*Калі Бог дазваляе вам убачыць Яго святасць, як калісьці Ісаю ў святыні, ці не перажываеце вы тады такіх пачуццяў, як: поўная павагі боязь, узрушэнне ўсёй асобы, жывое ўсведамленне не толькі сваёй марнасці перад абліччам Велічы, але таксама сваёй грэшнасці?..*

*Калі вы зможаце ўзгадаць шматлікія ласкі, якія вы атрымалі ва ўсім сваім жыцці, ці тады падзяка (гэты імпульс стварэння да Стварыцеля), якая з'яўляецца як скок сына ў кірунку айца, не ўзносіць вас на вышыню?*

*А калі аднойчы усвядоміце тую бясконцую любоў, якой вас любяць, ці не прыйдзе адразу у галаву, каб назаўсёды прысвяціць сябе Богу, у ахвяры ўсяго вашага жыцця?*

*Цяпер вы разумееце словы, якія кажуць, што малітва – гэта адказ душы ў Божай прысутнасці. Зразумела, што ўсе магчымыя ўнутраныя пастаўы не прысутныя ў кожнай малітве.*

*Кс. Анры Кафарэль*

- ***Абмен думкамі на сустрэчы***

- Ці ёсць у нас досвед супольнай малітвы? З якой супольнай малітвай вы ўжо сустракаліся?
- Ці малітва падчас сустрэчы суполкі для вас цяжкая, калі так, то чаму?
- Дзяленне Словам Божым уголас, дапамагае вам у набліжэнні да Бога, да пазнання Хрыста? Калі так, то распавядзіце, у чым гэта дапамога заключаецца. Калі не, то распавядзіце, чаму.

Можа вы хацелі б задаць нейкія іншыя пытанні датычныя малітвы ў супольнасці. Дашліце іх пілатуючай пары.

- ***Харызмат Руху і педагогіка***

Першай рысай супольнасці згодна з Евангеллем з'яўляецца супольная малітва. Другой рысай, якая вынікае з любові, з'яўляецца дапамога іншым. Гэтая братэрская дапамога адыгрывае важную ролю ва ўсіх сферах, але асаблівую вартасць яна мая ў духоўнай сферы. Такая дапамога ў суполках будзе мець форму «дзялення», якое дапоўніць дзяленне жыццём, аб якім гаворка ішла на першай сустрэчы.

---

Узаемная дапамога ў лоне суполкі Маці Божай мае асаблівыя рысы: сужэнствы дапамагаюць адзін аднаму будавацца ў Хрысце (будаваць сужэнства – гэта нястомная справа) і аддаваць сваю любоў на паслугі Божага Валадарства.

Карта END

---

Момант, калі мы дзелімся жыццём, датычыць хутчэй нашага сямейнага жыцця і іншых аспектаў нашага штодзённага жыцця. Момант, калі мы дзелімся духоўным узрастаннем, будзе звязаны з рэалізацыяй канкрэтных пунктаў высілку, якія мы пастпова будзем уводзіць у практыку сужэнстваў, якія крочаць шляхам, прапанаваным Рухам Equipes Notre-Dame. Малітва – гэта перад усім зварот да

Божай сілы. Рэалізацыя канкрэтных пунктаў высілку – гэта зварот да Божай сілы, але таксама да сведчання і высілкаў кожнага ўдзельніка Руху, кожнага сужэнства.

Пункты высілку – што гэта такое і як трэба іх уводзіць у штодзённую рэчаіснасць вашых сужэнстваў, усё гэта будзе агаворвацца на наступных сустрэчах. Пункты высілку, якія прапаноўвае Рух Equipes Notre-Dame, наступныя:

- Рэгулярнае «слуханне» Божага Слова.
- Штодзённае прызначэнне часу на «сустрэчу» з Богам «тварам у твар» (асабістая малітва).
- Штодзённая сустрэча мужа і жонкі на сужэнскай малітве (і, калі гэта магчыма – сямейнай).
- Штомесячны сапраўдны сужэнскі дыялог у прысутнасці Бога («Сядзем разам»).
- Устаноўка «правіла жыцця» і штомесячны яго перагляд.
- Штогадовы ўдзел у рэкалекцыях (прынамсі 48-гадзінных і, калі гэта магчыма, супольна з сужонкам), каб стаць тварам да твару перад Богам.

Хай гэты спіс не пужае вас і не адштурхоўвае! Канкрэтныя пункты высілку будуць уводзіцца ў практыку паступова падчас пілатажу. Пасля заканчэння пілатажу, як паказвае досвед многіх сужэнстваў, вы і надалей будзеце развіваць сваю духоўнасць, рэалізуючы канкрэтныя пункты высілку. Узрастанне не мае канца.

Рэалізацыяй «абавязкаў», канкрэтных пунктаў высілку, мы будзем дзяліцца з вамі на сустрэчах суполкі. Гэта дазваляе сужэнствам узаемна дапамагаць адно аднаму крочыць шляхам Евангелля. Гэта павінна адбывацца ў атмасферы малітвы і разумення.

### 3. Заданні на час паміж сустрэчамі



- **Памятайце аб штодзённым супольным чытанні малітвы *МАГНІФІКАТ*.**
- Прачытайце фармацыйныя матэрыялы на трэцюю сустрэчу. Паразмаўляйце на гэтую тэму, пастарайцеся адказаць на пытанні, пастаўленыя ў трэцяй сустрэчы.
- Падрыхтуйцеся ў сужэнстве да дзялення жыццём. Вызначце, што было найважнейшым для вас за апошні час і чым вы хацелі б падзяліцца з іншымі сужэнствамі.
- Дашліце сваю інтэнцыю, аб малітве у якой вы папросіце іншых на сустрэчы.

У матэрыялах падрыхтаваныя пытанні для абмену думкамі на сустрэчы. Магчыма вы ўбачыце, што нейкія іншыя праблемы, нейкія іншыя пытанні ў тэме да абмену думкамі на сустрэчы для вас больш цікавыя. Дашліце тады свае прапановы пілатуючай пары.